4. *Ларина, А. Н.* Визитные карточки времени [Электронный ресурс] / А. Н. Ларина // Мир музея. – 2015. – № 1. – Режим доступа : www. mirmus.ru/2015/2015-01/425-vizitny-kartochki-vremeni.html. – Дата доступа : 3.12.2016.

5. *Самбур, М. В.* Интерпретация открыток в выставочном пространстве [Электронный ресурс] / М. В. Самбур. – Режим доступа : www. gramota.net/372014/2-1/44. html. – Дата доступа : 5.12.2016.

6. *Самбур, М. В.* Открытка в контексте культуры: атрибуция, научное описание, экспонирование : дис. … канд. культурологии : 24.00.03 / М. В. Самбур. – М., 2014. – 126 с.

7. *Чапкина, М. Я.* Привет из столицы. Советская поздравительная открытка 1917–1991 годов / М. Я. Чапкина. – М. : Контакт-культура, 2013. – 256 с.

***С. А. Паўлава,***
*кандыдат філалагічных навук, дацэнт,*
*прафесар кафедры менеджменту*
*інфармацыйна-дакументнай сферы*

# САЦЫЯЛЬНЫЯ ТЭХНАЛОГІІ ЯК АБ'ЕКТ БІБЛІЯТЭКАЗНАЎЧЫХ ДАСЛЕДАВАННЯЎ

Пераход да рынкавых адносін ва ўсіх сферах жыццядзейнасці соцыуму, змены інфармацыйнага стану грамадства прывялі да вызначанай трансфармацыі зместу форм работы бібліятэк. Гэта адлюстравалася на ўсіх сферах іх функцыянавання: сацыяльнай, эканамічнай, прафесіянальнай. Узнікла неабходнасць ужывання новых тэхналогій засваення сацыяльнай і бібліятэчнай прасторы.

Сацыялагічныя даследаванні паказалі, што розным відам дзейнасці характэрны свае тэхналогіі. Разглядаюцца тэхналогіі эканамічныя, палітычныя, гуманітарныя, тэхнічныя, сацыяльныя, кіраўнічыя, педагагічныя, экалагічныя і інш. Кожны з гэтых відаў мае сваю спецыфіку і прастору. У бібліятэчнай сферы маюць месца ўсе віды тэхналогій. Сацыяльныя тэхналогіі ў бібліятэках выкарыстоўваюцца даўно, але ў якасці асобнага аб'екта іх дзейнасці вывучаліся недастаткова і фрагментарна. Роля і месца сацыяльных тэхналогій у структуры бібліятэчнай дзейнасці канцэптуальна не вызначаны.

Па меры пашырэння прыкладных функцый навуковых ведаў з'яўляецца магчымасць тэхналагізіраваць тыя віды дзейнасці, якія раней былі гэтаму недаступныя. Таму ў апошні час атрымалі распаўсюджанне такія тэрміны як «тэхналогія кіравання», «тэхналогія зносін», сацыяльная тэхналогія і інш. Праз прызму тэхналагізацыі можна разглядаць усю сукупнасць сродкаў, якія выкарыстоўвае грамадства для эфектыўнага функцыянавання – ад вышэйшых органаў улады да спецыфічных сацыяльных інстытутаў.

Тэрмін «тэхналогія» ў гуманітарных навуках адносяць да навейшых паняццяў, абсалютная большасць якіх у слоўніках звязана з вытворчай сферай жыцця грамадства. Але ніякія вытворчыя тэхналогіі не могуць быць рэалізаваныя без мастацтва чалавечых адносін і чалавеказнаўчых тэхналогій (маецца на ўвазе навуковая распрацоўка паняцця), але калі звярнуцца да тлумачэння тэхналогіі як тэрміна вытворчай сферы, можна заўважыць, што яно прымальнае і для сацыяльнай сферы, працэсаў выхавання і кіравання. Вызначэнне, якое дае энцыклапедычны слоўнік: «Тэхналогія (ад грэч. techne – мастацтва, майстэрства, уменне і …логія – веды) – сукупнасць метадаў апрацоўкі, вырабу, змяненне стану, якасцей, форм сыравіны, матэрыялаў, … якія здзяйсняюцца ў працэсе вытворчасці прадукцыі. Задача тэхналогіі як навукі – выяўленне фізічных, хімічных, механічных і іншых заканамернасцей з мэтай вызначэння і выкарыстання на практыцы найбольш эфектыўных і эканамічных вытворчых працэсаў» [1, с. 1338].

У гэтым вызначэнні праглядаецца тры змястоўных аспекты. Перш за ўсё гэта сукупнасць метадаў. Любая сукупнасць прадугледжвае рознабаковасць, сістэмнасць, комплекснасць, а не звычайную лінейнасць. Прадугледжвае, але якасць залежыць ад майстэрства, умення выканаўцы. Другая мэтавая ўстаноўка – змяненне стану, прыкметаў аб'екта ўздзеяння. Развіццё ўсіх сацыяльных сістэм, у тым ліку і бібліятэкі, звязана са змяненнямі. Змяненні могуць насіць канструктыўны і парушальны характар. Таму перад тэхналогіяй як навукай ставіцца задача выяўленне заканамернасцей і выкарыстанне тых з іх, якія дадуць станоўчы эфект на практыцы. Як бачым, трэці аспект тэрміна звязвае навуковы, рацыянальны кампанент з чала-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

вечым, асабовым кампанентам, у які ўкладаецца як рацыянальны, так і эмацыянальны пачатак [3, с. 85].

Пытанні ўкаранення сацыяльных тэхналогій дастаткова поўна разглядае буйнейшы спецыяліст у вобласці сацыялогіі Ж. Т. Тошчанка. Аналізуючы розныя пункты гледжання і сутнасныя характарыстыкі сацыяльных тэхналогій (В. Г. Афанасьева, М. М. Маркава, А. К. Зайцава, В. В. Шчарбіны і інш.), аўтар дае наступнае вызначэнне гэтага паняцця. Сацыяльная тэхналогія – гэта сукупнасць паслядоўных аперацый, працэдур мэтанакіраванага ўздзеяння і рэалізацыі намечаных планаў (праграм, праектаў) і атрымання аптымальнага сацыяльнага выніку. Ж. Т. Тошчанка падкрэслівае найбольш важныя моманты, што сацыяльныя тэхналогіі – гэта вызначаны спосаб дасягнення грамадскіх мэтаў, які складаецца з аперацыйнага здзяйснення дзейнасці; аперацыі распрацоўваюцца папярэдне, планамерна; іх распрацоўка праводзіцца на аснове і з выкарыстаннем навуковых ведаў і ўлічваецца спецыфіка сферы грамадскага жыцця, у якой адбываецца гэта дзейнасць; сацыяльная тэхналогія выступае ў дзвюх формах: як праект і як сама дзейнасць, пабудаваная ў адпаведнасці з гэтым праектам [2, с. 586–591].

Таксама ў сваёй працы Ж. Т. Тошчанка адзначае, што распрацоўка, канструктаванне і рэалізацыя патрабаванняў сацыяльнай тэхналогіі адбываецца ў некалькі этапаў: тэарэтычны этап – вызначэнне мэты аб’екта тэхналагізацыі, раздзяленне сацыяльнага працэсу на складаючыя і выяўленне сувязяў паміж імі; метадычны этап – выбар метадаў, сродкаў атрымання інфармацыі, яе апрацоўкі, аналізу, прынцыпаў яе трансфармацыі ў канкрэтныя вывады і рэкамендацыі; працэдурны этап – арганізацыя практычнай дзейнасці па рэалізацыі патрабаванняў сацыяльных тэхналогій. Асаблівую ўвагу аўтар надае праблеме «работы» сацыяльных тэхналогій на преспектыву, якая прадугледжвае магчымыя страты на шляху, але акупаецца тым, што ўжываецца ў жыццё асноўная, вядучая ідэя [2, с. 594].

Канцэптуальнае асмысленне ролі сацыяльных тэхналогій у бібліятэчнай дзейнасці павінна грунтавацца на метадалагічнай аснове бібліятэказнаўства, якая адлюстравана ў розных падыходах. У дачыненні да нашага аб’екту мэтазгодным уяўляецца асмысліць ролю бібліятэкі як сацыяльнага інстытута з пазіцый

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

сацыяльна-тэхналагічнага падыходу (Н. В. Якаўлева). Катэгорыя «бібліятэчная дзейнасць» з'яўляецца базавай, якая вызначае кола з'яў і вобласць тэхналогій агульных для ўсяго прафесіянальнага бібліятэчнага супольніцтва. Бібліятэчная дзейнасць сацыяльна-тэхналагічная па сваёй сутнасці і скіравана на задавальненне сацыяльных патрэб людзей і выконвае сацыяльныя функцыі. Гэта дазваляе выкарыстоўваць прыёмы і спосабы актыўнага ўздзеяння на сацыяльныя сістэмы розных якасцей, маштабаў і ўзроўняў арганізацыі, улічваць усю разнастайнасць унутраных і знешніх сувязей сацыяльных з'яў у межах бібліятэкі, шматварыянтнасць іх змяненняў. Дадзены падыход дазваляе з новых пазіцый да тэарэтычных і прыкладных даследванняў у бібліятэчнай справе ўпарадкаваць сістэму ўзаемадзеяння сацыяльных і вытворчых тэхналогій у бібліятэках.

Акрамя гэтага сацыяльна-тэхналагічны падыход дазваляе айчыннаму бібліятэказнаўству фарміраваць партнерскія адносіны з рознымі арганізайнымі кантэкстамі. Сацыяльна-тэхналагічны падыход шматаспектны па свайму зместу: ён уключае сацыяльна-дзеясны, камунікацыйны аспекты, якія дазваляюць паглыблена раскрыць «бібліятэчную дзейнасць як базавую катэгорыю нашага аб'екта». На наш погляд, сацыяльна-тэхналагічны падыход базіруецца на структурна-функцыянальным, які дазваляе асмысліць бібліятэку як сістэмны аб'ект, які характарызуецца асобаснай структурай, устойлівымі ўзаемасувязямі паміж асобнымі элементамі і падсістэмамі, спецыфічнымі функцыямі кампанентаў і сістэмы (Ю. М. Сталяроў). Гэты падыход дазваляе разглядзець сацыяльныя тэхналогіі як элемент сістэмы «бібліятэка», а на больш ніжэйшым узроўні – як сістэму з вылучэннем падсістэм (элементаў), якія складаюць відавую структуру сацыяльных тэхналогій, якімі могуць лічыцца: маркетынгавыя тэхналогіі, прынцыпы сучаснага менеджменту, тэхналогіі паблік рылейшнз, праектаванне і планаванне бібліятэчнай дзейнасці. Розныя аспекты выкарыстання новых сацыяльных тэхналогій у бібліятэчнай практыцы знайшлі адлюстраванне ў працах па бібліятэчнаму праектаванню (Н. У. Жадзько), бібліятэчнаму менеджменту і маркетынгу (Н. М. Суслава, У. К. Клюеў), паблік рылейшнз (В. У. Арлоў, Л. В. Азарава), бібліятэчнай канфліктalогіі (А. Н. Ванееў).



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У апошні час у бібліятэчнай справе вылучыліся новыя накірункі – бібліясоцыялогія, аксіялогія, бібліятэчная інаватыка, бібліятэчная педагогіка, што патрабуе інакш асмысліць праблему класіфікацыі сацыяльных функцый бібліятэкі. Гэта прадстаўлена ў даследваннях М. І. Акілінай, А. М. Ванеева, А. В. Сакалова, Р. С. Матульскага. У працах гэтых аўтараў закладзена новая філасофія бібліятэчнай дзейнасці, дзе сацыяльныя тэхналогіі – важны элемент сістэмы кіравання. Сацыяльнае кіраванне сёння патрабуе распрацоўкі навукова абгрунтаваных падыходаў, у якіх мэтазгодны вылучыць такі важны элемент як гуманізм у кіраванні людзьмі і іх супольніцтвамі. Гуманістычны падыход прадугледжвае, што каштоўнасці чалавека павінны ставіцца ў цэнтр працэсса кіравання. Гуманізм як светапогляд праяўляецца праз гуманнасць, гэта значыць чалавечую прыроду, адукаванасць, духоўную культуру. Вынікам укаранення сацыяльных тэхналогій з'яўляецца развітая арганізацыйная і камунікатыўная сістэмы бібліятэкі, яе ўнутранае і знешняя асяроддзе. Сацыяльныя тэхналогіі можна разглядаць як неабходны працяг вытворчай тэхналогіі, якія мадэліруюць не асобныя працэсы бібліятэчнай практыкі, а жыццядзейнасць бібліятэкі ўвогуле і з'яўляецца формай прафесійнага развіцця; яны ўяўляюць сабой сукупнасць сродкаў засваення і ўздзеяння на бібліятэчную прастору.

Глыбінны сэнс выкарыстання сацыяльных тэхналогій у бібліятэчнай дзейнасці складаецца ў павышэнні эфектыўнасці сіл і сродкаў, якія затрачываюцца на дасягненне мэтаў, аптымальнасці вызначэныя метадаў і сродкаў. Сацыяльныя тэхналогіі выступаюць як інтэлектуальны рэсурс, выкарыстанне якога дазваляе не толькі вывучыць і прадказаць розныя сацыяльныя перамены, але і актыўна паўплываць на практычнае жыццё, атрымаць эфектыўны прагназуемы сацыяльны вынік.

---

*1.* Советский энциклопедический словарь / под. ред. А. М. Прохорова [гл. ред.]. – М. : Советская энцикл., 1979. – 1632 с.

*2.* Социология труда : учеб. / под ред. Н. И. Дряхлова, А. И. Кравченко, В. В. Щербины. – М. : Изд-во Моск. ун-та, 1993. – 315 с.

*3. Тощенко, Ж. Т.* Социология. Общий курс. 3-е изд. / Ж. Т. Тощенко. – М. : Юрайт, 2005. – 640 с.

*4. Украинец, П. П.* Социология менеджмента. Основы теории и искусство практики / П. П. Украинец. – Минск : ФУАинформ, 2010. – 332 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ